Веcткі й Паведамленьні

інфармацыйны бюлетэнь Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

Viestki j Paviedamleńni

Сусьветнае сеціва: *e-krama.com, pahonia.com*
Электронны адрас: *viestki@mail.com*
✉ *P. O. Box 3225, Farmingdale, NY 11735*

№ 2 (600)
Люты 2016 г.

Прэзэнтацыя альманаха “Беларус” у Нью-Ёрку

У суботу 26 сьнежня ў Доме Маракоў на Мангэтане прайшоў сход Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “Пагоня”, на якім адбылася прэзэнтацыя чарговага выпуску літаратурнага альманаху “Беларус”.

Напачатку сходу з кароткім словам выступіў старшыня Згуртаваньня “Пагоня” Віталь Зайка. Ён распавёў пра дзейнасьць арганізацыі ў адыходзячым годзе і заклікаў прысутных даваць прапановы адносна таго, якой яны хацелі б бачыць працу арганізацыі ў наступным годзе.

Затым выступіў старшыня Беларускага Народнага Фронту і Партыі КХП-БНФ Зянон Пазьняк. Ён распавёў пра бягучы момант і пра цяперашняе палітычнае становішча ў Беларусі й вакол яе. Ён, у прыватнасьці, сказаў: “Кіраваньне Лукашэнкі доўжыцца ўжо 21 год. Яно завяло краіну ў тупік, вынішчаецца нацыянальная культура, лукашэнкаўскі рэжым апынуўся ў міжнароднай ізаляцыі, эканоміка знаходзіцца ў поўнай стагнацыі. Здавалася б, усё дрэнна, і надзеяў ніякіх няма. Але, калі азірнуцца на гісторыю, дык можна сказаць, што падобная сытуацыя шмат у чым назіралася і ў сярэдзіне 1980-х, у часы непадзельнага камуністычнага панаваньня. Людзі мелі свае думкі, займаліся ўласным жыцьцём, расьцілі дзяцей, працавалі. Але калі надыйшоў момант, калі раптам зьявілася мажлівасьць пачаць рух убок нацыянальнага адраджэньня – адкуль што і ўзялося, людзі сталі выходзіць на мітынгі, зьявіліся рухі й партыі, раптам ўзьнялася хваля таго нацыянальнага аднаўленьня другой паловы 1980-х. Людзі зрабіліся палітычна актыўнымі, патрыётаў большала з кожным днём, і неўзабаве, празь некалькі год, Беларусь сталася незалежнай дзяржавай.



Таму і цяпер трэба быць гатовымі. Трэба не паддавацца на правакацыі. І грамадзтва ў пэўны час палыхне. Але калі няма падрыхтоўчай працы – тады дзейнасьць па аднаўленьні незалежнасьці й свабоды можа запаволіцца, можа змарнавацца”.

Сп. Пазьняк далей спыніўся на сваіх сустрэчах з патрыятычна настаўленай беларускай моладзьдзю ў Варшаве, з прадстаўнікамі тактычнай групы “Беларусь”, якія змагаюцца супраць расейскага імпэрыялізму, дапамагаючы братам-украінцам на ўсходзе Ўкраіны. Ён таксама адзначыў непасьлядоўную і бязглуздую палітыку Эўразьвязу і наагул заходніх урадаў у дачыненьнях з Лукашэнкам, і ва ўсім усходнеэўрапейскім рэгіёне. Прычым ужо ня раз заўважалася, што як Захад пачынае гульню з рэжымам, здымае санкцыі, дае крэдыты – дык рэжым бярэцца яшчэ мацней душыць нацыянальныя сілы. Нават перасталі весьці гутарку аб правох чалавека, і як сымболь патаптаньня тых правоў, рэжым адкрывае ў Магілёве помнік “чэкістам”-НКВДыстам! У тым самым Магілёве, дзе забілі Гартнага, Байкова ды тысячы іншых нацыянальных дзеячоў. І вось там ставаць помнік не ахвярам, не патрыётам Беларусі, а катам, забойцам. Ды яшчэ з надпісамі па-беларуску – гэткая рафінаваная подласьць. Гэта як сыгнал, што ні на якія рэформы рэжым ня пойдзе. Але мы мусім быць гатовыя да любых паваротаў падзеяў, і трэба назапашваць сілы, выкарыстоўваць мэтад ланцуговай рэакцыі. Грамадзтва

працяг на бачыне 2



Шаноўныя сябры!

Разам са студзеньскім нумарам ***“Вестак і Паведамленьняў”*** кожны падпісчык у якасьці падарунка за сваю прыхільнасьць атрымаў насьценны **каляндар Згуртаваньня “Пагоня”** на 2015 год.

Тыя асобы, хто не выпісваюць бюлетэнь, могуць набыць каляндар (*кошт разам зь перасылкаю **$10***), даслаўшы аплату ў рэдакцыю па пошце або завітаўшы на старонку **e-krama.com**

Студзеньскі сход Згуртаваньня "Пагоня"

Першы ў гэтым годзе сход Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня "Пагоня" прайшоў у суботу 9 студзеня на традыцыйнай пляцоўцы – у Доме Маракоў на Мангэтане. Напачатку старшыня Віталь Зайка распавёў пра дзейнасьць "Пагоні" ў 2015 годзе. Затым ён запрасіў усіх разам абмеркаваць і скласьці плян імпрэзаў Згуртаваньня "Пагоня" на бліжэйшы год. Сп. Зайка выказаў свае прапановы пра тое, каб наладзіць сэрыю інфармацыйных і практычных гутарак па пытаньнях, што хвалююць і закранаюць большасьць землякоў, якія апынуліся ў Амэрыцы. Гэта, найперш, як знайсьці працу, як і куды паступіць на вучобу, дзе знайсьці грошы на яе аплату, якую спэцыяльнасьць абраць. Таксама важным ёсьць пытаньне зьмены і набыцьця юрыдычнага статусу і, магчыма, што кіраўніцтва арганізацыі зможам знайсьці юрыстаў, якія пагадзіліся б прыйсьці й правесьці гутаркі па пытаньнях палітычнага прытулку, выкліку родзічаў ды розных іншых пытаньняў.

Сп-ня Валянціна Якімовіч выступіла з інфармацыяй пра традыцыйныя абрады Гуканьня Вясны і Купальля, што ладзіліся ёю, і заклікала прысутных, што маюць сьпявацкія і музычныя здольнасьці, далучацца, паведаміць пра свае таленты й зацікаўленьні. Сп-ня Якімовіч таксама адзначыла, што часта новапрыбылым бракуе самай элемэнтарнай інфармацыі пра свае правы і абавязкі, пра розныя праграмы і напрыклад, пра пэнсыйнае забясьпечаньне – і гэта таксама можна было б улучыць у праграму гутарак, каб людзі ведалі, што іх чакае ў Амэрыцы, і што яны могуць чакаць ад дзяржавы ў выглядзе дапамогі й магчымасьцяў самарэалізацыі.

Да гутаркі далучыўся сп. Зьміцер Левіт, які падзяліўся сваім досьведам першых гадоў жыцьця ў Злучаных Штатах, пра працу ў кар-сэрвісе. Сп. Левіт засьцярог ад карыстаньня падробленымі нумарамі сацыяльнага страхаваньня (Social Security), бо калі напачатку праблемы могуць быць нябачнымі, дык могуць яны усплывуць.

Сп-ня Валянціна Якімовіч паведаміла пра небясьпеку фальшывых шлюбаў і пра несумленных юрыстаў, якія выкарыстоўваюць неабазнаных новапрыбылых, каб выцягнуць грошы, не выконваючы ўзятых на сябе абавязкаў.

Размова пайшла пра якасьць працы адвакатаў, і прысутныя дзяліліся дадатнай і адмоўнай інфармацыяй аб гэтым. Сп. Віталь Зайка заклікаў усіх, хто мае досьвед працы з юрыстамі, паведамляць, каго яны парэкамэндавалі б землякам для вядзеньня справаў палітычнага прытулку ды іншых.

Сп. Алесь Тур паведаміў пра сваю вучобу ў Калюмбійскім унівэрсытэце па спэцыяльнасьці эканоміка і пра працу ў сфэры фінансаў. Ён адзначыў, што ахвотна ўзяў бы ўдзел у інфармацыйных гутарках па пытаньнях вучобы і працы.

Напрыканцы адбыліся знаёмствы з гасьцямі "Пагоні" і пасьля ў неафіцыйнай частцы ўдзельнікі сходу маглі працягнуць знаёмствы ў вольнай таварыскай атмасфэры.

Віталь ЗАЙКА

Прэзэнтацыя і сход

працяг з бачыны 1

высьпявае, грамадзтва мае шмат не адкрытых яшчэ мажлівасьцяў і рэсурсаў.

Затым пачалася ўласна прэзэнтацыя альманаха "Беларус". Вёў яе рэдактар выданьня Марат Клакоцкі. Напачатку ён коратка спыніўся на мэтах выданьня і на гісторыі стварэньня альманаху. Усё пачалося ў 2007 годзе, няшмат хто быў пэўны, што альманах пратрымаецца болей за адзін-два нумары. Але, дзякуючы падтрымцы сп. Вітаўта Кіпеля, іншых дабрадзеяў-аматараў беларускай культуры, што фундавалі выданьне, маем цяпер ужо дзявяты ягоны выпуск, з працамі 25 беларускіх аўтараў з 10 краінаў сьвету.

Выданьне ад пачатку было скіраванае на друк аўтараў, якія стала жывуць па-за межамі Беларусі, бо на Бацькаўшчыне, нават пры ўсіх цяжкіх умовах, магчымасьці апублікавацца па-беларуску ўсё ж існуюць, а вось на чужыне іх няма, ці дакладней, не было зусім. Узровень і падбор аўтараў неаднастайны, але мэтаю было не стварэньне выданьня для прафэсійных літаратараў, але спроба адшукаць творчыя сілы сярод прадстаўнікоў беларускай грамады на чужыне, паказаць, што тут таксама можна займацца творчай дзейнасьцю па-беларуску, заахвоціць людзей да рэалізацыі сваіх творчых памкненьняў.

Затым сп. Клакоцкі запрасіў выступіць прысутных аўтараў альмнаха. Першым быў сп. Віталь Зайка, які апублікаваў сваё новае апавяданьне. Ён коратка спыніўся на гісторыі й матывах напісаньня свайго твора і адзначыў, што нацыянальна арыентаваныя і шукаючыя сваёй нацыянальнай ідэнтычнасьці асобы існавалі заўсёды, так як існуюць яны цяпер. Тады, у 1970-я, калі беларускі нацыянальны ляндшафт выглядаў спляжаным, мёртвым, людзі працягвалі шукаць сваю Беларусь,ісьці да яе. Таму праблема, і тады і цяпер, у пошуку й зьвядзеньні неабыякавых людзей разам, у гадаваньні нацыянальнай салідарнасьці. У дадатак Зайка прачытаў некалькі сваіх перакладаў: вершы Марыі Паўлікоўскай "Шэйх" і Томаса Гарды "Пярэдадзень Новага году".

Наступным выступіў Зянон – сп. Зянон Пазьняк, які дэбютаваў у альманаху з падборкамі сваіх апавяданьняў і вершаў. Сп. Пазьняк, між іншага, сказаў: "Я прачытаў амаль усю кніжку альманаха. Добрае ўражаньне ад падборкі і ад самых твораў. У Беларусі ня кожны аўтар, што хацеў бы надрукавацца, можа зрабіць гэта. І вельмі добра, што тут, далёка ад Бацькаўшчыны, ёсьць альманах, рэгулярна выдаецца. І таму дазвольце выказаць сваю павагу і захапленьне яго рэдактару сп. Марату Клакоцкаму. Вось прыклад таго, як чалавек ахвярна і мэтанакіравана робіць справу". Сп. Пазьняк заўважыў, што ў альманаху ёсьць добрыя пераклады, і вось адзінае, хіба, чаго не стае – гэта добрай літаратурнай крытыкі, як жанру. Потым ён распавёў пра сябе, пра тое, што вершы пісаў раней ужо шмат, а вось проза выйшла першы раз, бо патрабуе часу і больш мэтадычнай працы. Наагул паэзію пісаў даўно, з маладых гадоў, але не адчуваў упэўненасьці, пісаў у шуфляду аж да выхаду ў 2000 годзе зборніку "Глёрыя Патрыя", хоць некалі паасобныя творы друкавалі ў "Полымі".

Сп-чня Марына Кражова ўжо не ўпершыню публікуе ў альманаху свае вершы, вось і сёлета яна надрукавала творы, поўныя патрыятычных і лірычных матываў. Падчас прэзэнтацыі сп-чня Кражова прачытала свой верш "Штурхаюць", у якім адлюстравала сваё бачаньне выявы беларускага народу.

Сп. Марат Клакоцкі паведаміў, што адзін з аўтараў Эмігідыюш Рыжы (Архіяпіскап Юры) адыйшоў з жыцьця ў лістападзе, і папрасіў ўшанаваць ягоную памяць хвілінай цішы. У цяперашнім нумары надрукаваныя ягоныя біяграфічныя нарысы пад назваю "Мой пачатак".

Сп. Сяржук Сокалаў-Воюш распавёў пра сваё апавяданьне "Грак" і пра патрэбу супэр-героя ў беларускай літаратуры, якога не было хіба ад часоў У. Караткевіча. Гэта такі сабе "беларускі Рэмба", безаглядны герой, які робіць сваю беларускую справу без усялякіх сэнтымэнтаў, наўпрост. У наступным нумары будзе працяг. Сп. Сокалаў-Воюш распавёў пра свае іншыя праекты: Тэрміналягічны слоўнік Асманскай імпэрыі, больш 500 ст., і Біяграфічны даведнік паўстанцаў

заканчэньне на бачыне 3

Трэцяя кніга пра Раду БНР на эміграцыі

Гардзіенка, Наталля; Юрэвіч, Лявон. Рада БНР (1982—1997): Падзеі. Дакументы. Асобы. Мінск: Кнігазбор, 2015. — 224 с. — (Бібліятэка Бацькаўшчыны: кн. 28). — (Наклад 200 ас.)



Новая кніга Натальлі Гардзіенкі і Лявона Юрэвіча, выдадзеная ў 2015 годзе, зьяўляецца своеасаблівым заканчэньнем "трылёгіі", прысвечанай гісторыі паваеннай Рады БНР. Гэтым разам у цэнтры ўвагі дасьледнікаў знаходзіўся пэрыяд кіраваньня Язэпа Сажыча.

1982–1997 гг. закранулі важныя і нават драматычныя падзеі ў жыцьці як беларускай эміграцыі, гэтак і мэтраполіі, што мелі спэцыфічны ўплыў на дзейнасьць Рады БНР. Раскол у БАПЦ і сумнавядомая "справа Лофтуса" адмоўна паўплывалі на беларускую грамаду на Захадзе наогул і на актыўнасьць беларускага дзяржаўнага прадстаўніцтва на выгнаньні. Аднак перабудова ў СССР і ягонае падзеньне, зьяўленьне незалежнай Рэспублікі Беларусь, ня толькі актывізавалі кантакты дыяспараў з мэтраполіяй, але й паставілі на парадак дня пытаньне пра лёс БНР. У той час, калі іншыя эміграцыйныя ўрады спынялі сваё існаваньне, перадаючы паўнамоцтвы новаўтвораным уладным структурам мэтраполіі, беларускія палітыкі-эмігранты занялі пазыцыю чаканьня. У выніку, Рада БНР ня толькі ня зьнікла, але й атрымала імпульс для абнаўленьня сваёй дзейнасьці і шэрагаў за кошт новых радных зь ліку новых эмігрантаў, а таксама беларусаў постсавецкага замежжа. Усе згаданыя пэрыпэтыі дзейнасьці (а часам бязьдзейнасьці) Рады БНР у часы кіраваньня Язэпа Сажыча прадстаўленыя ў гістарычным нарысе на пачатку кнігі.

Наогул жа структура новай працы Натальлі Гардзіенкі і Лявона Юрэвіча цалкам адпавядае структуры папярэдніх двух выданьняў. За гістарычным нарысам ідзе разьдзел "Пратаколы", дзе прадстаўленыя тыя пратаколы сэсіяў Рады БНР, якія аўтарам удалося адшукаць у архіўных сховішчах. Да пратаколаў дадаюцца "Дакумэнты": маніфэсты, камунікаты, мэмарандумы. З улікам таго, што справаводства Рады ў часы Язэпа Сажыча вялося даволі эпізадычна, вялікае месца ў новым выданьні займае разьдзел "Ліставаньне". У карэспандэнцыі старшыні, Віталя Кажана, Раісы Жук-Грышкевіч, Аляксандра Лашука і іншых адлюстраваліся тыя нутраныя праблемы і працэсы, што адбываліся ў Радзе БНР у 1980-х–1990-х гг.

Даволі сьціпла, адпаведна зь дзейнасьцю дзяржаўнага прадстаўніцтва, выглядаюць "Бібліяграфія" і "Хроніка дзейнасьці Рады БНР". А ў разьдзеле "Асобы" прадстаўленыя тры тэксты: "Жыцьцяпіс амэрыканскага беларуса" Віталя Кажана, а таксама біяграфічныя нарысы пра Барыса Рагулю й Янку Запрудніка. Фактычна, менавіта на гэтых трох дзеячах трымалася Рада БНР у адзначаны пэрыяд.

Трэцяя кніга, прысьвечаная паваеннай Радзе БНР, падводзіць своеасаблівы вынік яе дзейнасьці за 50 гадоў. Чытач можа ўбачыць, як зьмяніліся ўмовы існаваньня Рады, яе прыярытэты й магчымасьці. Зьмешчаныя ва ўсіх частках "трылёгіі" тэксты дазваляюць ацаніць ролю і месца дзяржаўнага прадстаўніцтва як у эміграцыйнай грамадзе, гэтак і для паваеннай гісторыі беларускай нацыянальнай ідэі наогул. Захаваньне ідэі незалежнай дзяржаўнасьці, безумоўна, зьяўляецца найбольш значным вынікам паўвекавой гісторыі паваеннай Рады БНР, якая цяпер ужо, фактычна, даступная для азнаямленьня шырокай грамадзкасьці.

Я.С.

Прэзэнтацыя і сход

заканчэньне з бачыны 2

1863 году, больш за 10 тысяч біяграмаў – вельмі цікавыя асобы, цікавыя факты. Напрыклад, шляхціц з Кобрыншчыны Малахоўскі стаў на эміграцыі вынаходнікам фатастужкі, Унук аднаго з паўстанцаў стаў архітэктарам статуі Хрыста ў Рыа-дэ-Жанэйра. Унучка Вярыгі-Дарэўскага стала рэзыдэнткай ГПУ ў Варшаве, і ўскосна спрычынілася да пагібелі савецкага амбасадара Войкава. Сп. Сокалаў-Воюш высунуў ідэю літаратурных вечарынаў, якія ўлучалі б аналіз літаратурных твораў.

Пра сваё апавяданьне "Гаспадыня свайго лёсу" распавяла сп-ня Ганна Шарко. Яна адзначыла, што напісала яго ўжо даўно, трошкі перапрацоўвала, і вось нарэшце вельмі радая пабачыць яго надрукаваным. Яно прысьвячаецца памяці бабулі, якая натхняла ў жыцьці й заахвочвала да вывучэньня сваго роду, сваіх продкаў. Аўтарка падзякавала Марату Клакоцкаму і карэктарцы Віялеце Кавалёвай за дапамогу і падтрымку.

Затым з паведамленьнем пра свае творы і з аглядам усяго альманаху выступіла Валянціна Якімовіч. Яна паведаміла пра гісторыю напісаньня сваёй падборкі аўтабіяграфічных апавяданьняў "Мацiадзіночка і сацыялістычны рэалізм". Прамоўца спынілася на рэаліях таго часу, і на фактах сваёй біяграфіі. Яна таксама распавяла пра свае ўражаньні ад чытаньня твораў, надрукаваных у дзявятым выпуску альманаху "Беларус" (2015).

Напрыканцы прысутныя моцнымі воплескамі падзякавалі рэдактару альманаха і ягоным аўтарам. Пасьля заканчэньня афіцыйнай часткі прысутныя маглі адзначыць выхад альманаху "Беларус"-2015 пры віне і пачастунках, мелі мажлівасьць набыць новае выданьне, пагутарыць з рэдактарам і аўтарамі, і калегавацца зь землякамі.

Віталь ЗАЙКА

Конкурс працаў пра беларускае замежжа працягнуты да 1 сакавіка 2016 г.

На шматлікія просьбы ўдзельнікаў, працягнуты тэрмін прыёму працаў на конкурс, прысьвечаны гісторыі і сучаснасьці беларускага замежжа, які Згуртаваньне беларусаў сьвету "Бацькаўшчына" абвесьціла з нагоды свайго 25-гадовага юбілею. Можна паспець падаць працу да **1 сакавіка** на адрас: ***zbsb.minsk@gmail.com*** з пазнакаю **"На конкурс"**.

“Галгатня пра ЗыШыА”

Нашчадкі Вінету

Давайце правядзем экспэрымэнт. Перш чым працягваць чытаць гэты артыкул далей паглядзіце, калі ласка, на ілюстрацыю і падумайце, якое ейнае значэньне і які пасыл. Якія высновы вы зрабілі для сябе, паглядзеўшы на яе?

Гэты малюнак я ўбачыў у фэйсбукавым профілі майго знаёмага беларуса, які жыве ў Амэрыцы. Першае, што мне прыйшло ў галаву – няйнакш гэта перасьцярога перад прыманьнем ўцекачоў. Пасьля я паглядзеў папярэднія пасты знаёмага і здагадаўся, што ён, відаць, прыхільнік ня той палітыкі, якая перасьцерагала б перад наступствамі неабмежаванага прыманьня эмігрантаў. Ведаючы гэта, я разумеў, што ягоны пасыл павінен быць адваротным, але ўбачыць гэтую карцінку па-іншаму мне каштавала пэўных намаганьняў. І справа ня ў тым, каб паглядзець на сябе, на свой народ, сваю цывілізацыю крытычна – гэта, акурат, павінна лёгка давацца кожнаму інтэлігентнаму чалавеку, нават зь невялікай доляй абстрактнага ўяўленьня. Але для адваротнага (перавернутага з ног на галаву) разуменьня гэтай ілюстрацыі трэба ня толькі выйсьці са сьветабачаньня сваёй цывілізацыі, але таксама ўвайсьці ў карціну сьвету іншай, чужой цывілізацыі. У выніку такой псыхалягічнай замены абутку, чалавек пачынае глядзець на сваю цывілізацыю як на чужую... Але як такое наогул магчыма? Магчыма, з дапамогаю пэдагогікі сораму і мэдыйнымі псыхаапрацоўкамі нават немагчымае становіцца магчымым.



Справа, вядома, ня ў тым, каб сьлепа бараніць сваю цывілізацыю і казаць, што яна ніколі не рабіла памылак. Ад памылак неабароненая ніводная цывілізацыя, ніводны народ і аніводны чалавек. Але цалкам натуральным ёсьць той факт, што жыхар Нігерыі лічыць сваю цывілізацыю самай лепшай, грамадзянін Інданэзіі – сваю, а беларус, паляк ці ангелец – такой цывілізацыяй лічаць заходнюю цывілізацыю, цывілізацыю Эўропы і тых кантынэнтаў, якія Эўропа ўчыніла сваімі. На эпоху калянізатарства можна глядзець па-рознаму, але факт, што Эўропа падпарадкавала сабе такія значныя абшары далёкага сьвету таксама сьведчыць менавіта пра веліч гэтай цывілізацыі, асабліва, калі разглядаць гэтае пытаньне з пазыцыі таго часу, а не з пазыцыі нашых дзён.

Каб праверыць, ці разумее мой знаёмы, што малюнак можа мець процілеглае сымбалічнае значэньне, я пракамэнтаваў ягоны пост наступным чынам: “Ну і дзе цяпер тыя індзейцы, не ў рэзэрвацыях?” На што ён адказаў мне: “Малюнак скіроўвае ўвагу на белых, значная доля якіх прыбыла ў Амэрыку як уцекачы, але забылі пра гэта.”

А калі скіравацца ня ў той бок, куды скіроўвае малюнак, а спытацца пра індзейцаў? Што стала з індзейцамі? Які іх цяперашні статус? Якое месца яны займаюць у грамадстве і палітыцы на сёньняшні дзень? Колькі іх засталося? Урэшце – які факталягічны, а не ідэалягічны, урок для нас дае гісторыя нашых узаемадносінаў? Вось такім будзе прыклад адначасна спагадлівага і ўдумлівага бачаньня прадстаўніка заходняй цывілізацыі. Бачаньня без пераапрананьня і саманянавісьці.

Віталь ВОРАНАЎ

Уплаты ў Згуртаваньне Ñêëàäê³ é àõâÿðàâàíüí³:

З. Джум 60
В. Едзіновіч 60
А. Жывіцька 60
Я. Канаплянік 60
А. Корзун 60
П. Кузьняцоў 60
К. Макарэвіч 60
К. Нікіценка 60
М. Самусь 60
В. Хобатаў 60
А. Цыбулька 60

Усім шчыры дзякуй!

Уплаты ў аддзел шліце на адрас:
P. O. Box 572
New York, NY 10113

Чэкі выпісвайце на імя скарбніка Згуртаваньня “Пагоня”
Viktar Yedzinovich.

Наступны сход

Беларуска-Амэрыканскага Згуртаваньня “ПАГОНЯ”

адбудзецца ў суботу **13-га лютага 2016 года** на Мангэтане ў Доме Маракоў па адрасу:
Seafarers and International House
123 East 15th Street
New York, NY 10003.

*Даезд цягнікамі падземкі **L, N, Q, R, W, 4, 5, 6** да прыпынка **Union Square**.*

*Будынак знаходзіцца адзін блёк на ўсход ад **Union Square** па **15-й вуліцы** на скрыжаваньні з **Irving Place**.*

Заля сходаў на 2-м паверсе.

Пачатак: **а 6:00-й** вечара.

----

*Аб месцы і часе правядзеньня сходаў ды іншых імпрэзаў, ладжаных арганізацыяй, можна даведацца, наведаўшы сайт **pahonia.com***

Ахвяравалі на выданьне бюлетэня *Весткі й Паведамленьні*:

А. Гнідаш 40
Т. Бэрд 30
З. Джум 30
В. Едзіновіч 30
А. Жывіцька 30
Я. Канаплянка 30
А. Корзун 30
П. Кузьняцоў 30
К. Нікіценка 30
В. Паленік 30
Л. і П. Рыжыя 30
В. Трыгубовіч 30
В. Хобатаў 30
А. Цыбулька 30
Р. Карп 20

Шчыры дзякуй!

*Паважаныя **С. Козыраў, К. Штымак і Я. Яджак,** паведаміце рэдакцыі вашыя дакладныя паштовыя адрасы.*